Да гэтага часу яе ўтрыманне абыходзілася крыху больш як у мільён рублёў у месяц — дзякуючы льготам, устаноўленым гарадской уладай у дачыненні да памяшканняў, якія арэндаваны падобнымі ўстановамі.

З 1 красавіка гарвыканкам адмяніў усе ранейшыя пастановы, якія датычаць аплаты арэндных плошчаў, а значыць, — і льготы. Салон, які з-за таннасці ўваходных білетаў не прыносіць даходаў, не зможа вытрымаць новых расцэнак... У паніцы і самі мастакі. Пры адсутнасці льгот яны вымушаны будуць развітацца са сваімі майстэрнямі, размешчанымі ў прыстасаваных паўпадвалах, цокальных "паверхах" і на гарышчах. Выяўленчае мастацтва, якое праславіла Віцебск на ўвесь свет, апынецца ў становішчы ізгоя...

Сяргей СЯРГЕЕЎ.

У камісіях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

"Магутны Божа" — чым не гімн?

Для дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь у вышэйшай ступені падыходзіць песня М.Равенскага на вершы Н.Арсеньевай "Магутны Божа" — да такога заключэння прыйшла Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны, якая абмеркавала 20 красавіка на сваім пасяджэнні пытанне аб новым беларускім гімне. У прынятай наконт гэтага пастанове адзначана: прасіць Кабінет Міністраў забяспечыць на працягу бліжэйшых трох месяцаў штодзённую трансляцыю гэтай песні па рэспубліканскім радыё ў харавым выкананні для праслухоўвання ў ранішні час; унесці пытанне аб новым гімне на наступную сесію парламента.

Зрабіўшы свой выбар на карысць "Магутнага Божа", члены камісіі прывялі на сваім пасяджэнні наступную аргументацыю. Адзначалася, у прыватнасці, што тэкст зацверджанай у сярэдзіне 50-х гадоў песні "Мы, беларусы..." не вытрымаў праверкі часам. Як вядома, з канца 1991 года гучыць толькі музыка гімна. І гэта, на думку членаў камісіі, заканамерна: у мінулым засталася эпоха, адышоў у мінулае і часовы гімн нашай Айчыны, які не адлюстроўваў запаветных думак і спадзяванняў беларускага народа.

Аднак, на жаль, стварэнне новага гімна неапраўдана зацягнулася. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што перад паэтамі і кампазітарамі была пастаўлена надзвычай складаная творчая задача. Па-першае, гімн павінен быў мець выразныя асаблівасці, уласцівыя гэтаму жанру, — як у вершах, так і ў мелодыі. Па-другое, такі твор павінен быў адпавядаць самым высокім крытэрыям у мастацкіх адносінах. І нарэшце, па-трэцяе, у аснову зместу гімна павінны быць пакладзены думкі, мары і клопаты беларускага народа, усё тое, што складае ідэю народнага лёсу.

Праведзены ў 1992—1993 гадах конкурс на Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь, на думку журы, такога твора не выявіў. Дадатковы ж конкурс толькі для кампазітараў (на вершы Янкі Купалы "Маладая Беларусь") завяршыўся прапановай журы разгледзець у якасці магчымага гімна песню А.Багатырова на тэкст Купалы. З таго часу прайшло восем месяцаў, аднак урад, адзначалася на пасяджэнні камісіі, так і не ажыццявіў праслухоўвання сярод насельніцтва прапанаванага гімна.

Зыходзячы з гэтага, парламенцкая камісія зрабіла вывад, што дадзеная прапанова журы адхілена. Улічваючы, што выдатныя самі па сабе вершы беларускага песняра маюць пэўныя асаблівасці як у паэтычнай форме, так і ў стылістыцы і таму не зусім адпавядаюць жанравым патрабаванням гімна, камісія згадзілася з тым, каб не прапаноўваць гэтую песню ў якасці Дзяржаўнага гімна.

Між тым парламенцкая камісія лічыць: у Беларусі ёсць твор, які мае поўнае права стаць Дзяржаўным гімнам. Гэта песня М.Равенскага на вершы Н.Арсеньевай "Магутны Божа" — цудоўны твор, які дзякуючы сваёй змястоўнасці, глыбіні, насычанасці думкі, прастаце і даступнасці паэтычных вобразаў, магутнай і чароўнай мелодыі ўжо даўно палюбіўся многім грамадзянам рэспублікі, выконваецца шматлікімі прафесіянальнымі і самадзейнымі пеўчымі калектывамі. Дарэчы, на першым этапе конкурсу "Магутны Божа" быў прапанаваны ў якасці Дзяржаўнага гімна. Аднак тады гэта песня была адхілена большасцю журы, якія лічылі, што твор мае не свецкі, а быццам бы рэлігійны характар.

"Хто ўважліва чытаў гэты тэкст, а тым больш душой і сэрцам слухаў гэтую песню, наўрад ці згодзіцца з такім вывадам, — сказаў старшыня камісіі Ніл Гілевіч. — А тое, што ў яе ёсць нешта і ад Неба, ад традыцый канфесійнай песнятворчасці, — дык гэта для нацыянальнага гімна яшчэ і лепш, асабліва для гімна такога народа, з такім гістарычным лёсам, як беларусы".

Ну, а тым чытачам, хто не зусім добра памятае словы песні, напамінаем яе тэкст.

Магутны Божа! Уладар сусьветаў,
Вялізных сонцаў і сэрц малых,
Над Беларусяй ціхой і ветлай
Рассып праменьне свае хвалы.
Дай спор у працы будзённай, шэрай,
На хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць — дай!
Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу, і наш народ!

Ларыса ЛАЗАР,
Белінфарм.

ЗАМЕЖЖА

*ІТАР-ТАСС*ІНТЭРФАКС*НАРОДНАЯ ГАЗЕТА*

Пульс дня

Парламенцкія сувязі

ТОКІО. Устанаўленне паўнацэннага парламенцкага ўзаемадзеяння паміж Расіяй і Японіяй — галоўная мэта візіту ў Токіо дэлегацыі Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі. Аб гэтым заявіў яе старшыня Іван Рыбкін пасля прылёту ў японскую сталіцу. "Да гэтага часу, — адзначыў ён, — сувязі паміж вышэйшымі заканадаўчымі органамі дзвюх краін моцна адставалі ад таго ўзроўню, які склаўся ў Дзяржаўнай думы ў адносінах з іншымі вядучымі дзяржавамі свету. Эпізадычныя ж візіты лідэраў асобных фракцый не кампенсавалі патэнцыяльных магчымасцей парламенцкага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі".

Расія—Ірак

АМАН. Візіт расійскай урадавай дэлегацыі ў Багдад, які завяршыўся, быў прадуктыўны. Ён дапамог вызначыць шляхі завяршэння нашых старых праектаў у Іраку, якія былі ў рабоце да ўвядзення блакады, а таксама абмеркаваць перспектывы пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва, заявіў у інтэрв'ю кіраўнік дэлегацыі, міністр паліва і энергетыкі Расійскай Федэрацыі Юрый Шафранік. У ходзе візіту, паведаміў ён, былі падпісаны міжурадавае пагадненне і пратакол.

А.Чубайс аб стабілізацыі рубля

ВАШЫНГТОН. Ніколі за апошнія гады Расія не была так блізка да фінансавай стабілізацыі, як зараз. Аб гэтым заявіў тут першы намеснік старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Анатоль Чубайс, выступаючы на пасяджэнні Часовага камітэта савета ўпраўляючых Міжнароднага валютнага фонду. Цэнтральная задача для нас на сённяшні дзень — скараціць да сярэдзіны лета інфляцыю да 1—2 працэнтаў у месяц.

Візіт у Чэчню адкладзены

ПАРЫЖ. Падкамітэт па правах чалавека Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы даў згоду на перанос візіту дэлегацыі парламентарыяў ПАСЕ ў Чэчню на пачатак чэрвеня. Аб гэтым паведамляецца ў камюніке, якое паступіла са Страсбурга, дзе праходзіць чарговая сесія ПАСЕ. Першапачаткова гэты візіт планаваўся на пачатак мая, але расійская парламенцкая дэлегацыя, якая прымае ўдзел у рабоце сесіі ў якасці спецыяльнага запрошанага, папярэдзіла, што не можа даць падкамітэту ПАСЕ гарантый, што праграма трохдзённага візіту ў Чэчню і суседнія рэспублікі "будзе выканана ў гэтыя дні ў поўным аб'ёме".

Упрощены загранпоездки для жителей Литвы

Согласно подписанному Шангенскому соглашению, которое начало действовать с этой недели, литовским гражданам будет достаточно одной визы, чтобы путешествовать в семь западноевропейских стран.

С 26 марта граждане Литвы смогут свободно посещать Францию, Германию, Бельгию, Нидерланды, Люксембург, Испанию и Португалию с визой, выданной посольством или консульством одной из этих стран. Однако необходимо, чтобы виза была выдана дипломатической миссией страны, которую планируют посетить в первую очередь. Действие визы — 90 дней, с возможностью ее дальнейшего продления. Кроме того, в этом же году, но позже начнут действовать правила данного соглашения и в отношении Италии и Греции.

Александр ВАСИЛЕВСКИЙ.

Алкагольную "базу" закладвае... школа

Амаль што 14 мільёнаў амерыканцаў — звыш сямі працэнтаў насельніцтва ЗША — схільныя да алкагалізму. Як адзначаецца ў дакладзе Нацыянальнага інстытута па барацьбе са злоўжываннем алкаголем і алкагалізмам, цягай да спіртнога ў большай ступені вызначаюцца мужчыны, чым жанчыны, а сярод узроставых катэгорый — гэта моладзь ад 18 да 29 гадоў. Менш за ўсё алкаголікаў ва ўзроставай групе старэй за 65 гадоў. Супрацоўнікі інстытута тлумачаць гэта проста: праз меру ўжываючыя спіртныя напіткі рэдка дажываюць да такіх гадоў.

Што датычыцца цягі да алкаголю сярод моладзі, дык, на думку экспертаў, адпаведная "база" закладваецца яшчэ ў школьныя гады пад уплывам кругласутачнай тэле- і радыёрэкламы. Так, пасля дасягнення 18 гадоў амерыканскі школьнік бачыць па тэлевізары каля 100 тысяч рэкламных ролікаў, якія ўсхваляюць добрыя якасці піва. Вынік: згодна з афіцыйнай статыстыкай, падлеткі штогод выпіваюць звыш 1 мільярда бутэлек і бляшанак піва. Ёсць і іншая лічба — штогод амаль 130 тысяч амерыканцаў паміраюць у выніку злоўжывання алкагольнымі напіткамі.

З Нью-Йорка Аляксандр ПАХОМАЎ.

Светская хроника

Японский император одолжил орден у Хуана Карлоса

По вине своих придворных японский император Акихито лишился "Ордена золотого руна", которым его наградил в 1985 году испанский король Хуан Карлос I, и во время недавнего визита в Мадрид был вынужден одолжить на вечер новый экземпляр у монарших хозяев. Об этом было вынуждено сообщить в Токио Управление императорского двора, объясняя неожиданное появление его сотрудников в авиакомпаниях и аэропорту Нарита и расспросы о таинственной пропаже.

Оказалось, что сначала японские царедворцы, которые вроде бы славятся по всему миру своей непостижимой педантичностью и пунктуальностью во всем, умудрились забыть драгоценную награду в Токио, когда Акихито с супругой Митико отбыл в двухнедельное турне по Европе, включающее посещение Испании. Это вопиющее разгильдяйство, граничащее с нарушением монаршего этикета и оскорблением в адрес принимающей стороны, вскрылось во Франции буквально за день до переезда императора в Мадрид.

В пожарном порядке и обстановке повышенной таинственности, которая неизменно окружает дворцовый мир Японии, "Орден золотого руна" был доставлен в столичный аэропорт Нарита, где придворный высокого ранга, имя которого не раскрывается, передал сверток представителю испанской авиакомпании "Иберия", поскольку только она совершает беспосадочный рейс Токио—Мадрид.

Вздох облегчения — "Успели!" — сменился вполне отчаянием, когда по прибытии в испанскую столицу ордена в самолете... не оказалось. Назревал скандал — японскому монарху предстоял вечерний торжественный обед во дворце короля, куда по этикету полагалось облачиться во все знаки, к которому — непреложное правило — полагается, если есть, высший орден принимающего государства.

Естественно, до описанного Александром Дюма бессмертного сюжета с алмазными подвесками и дошло — Хуан Карлос I предоставил Акихито орден на один вечер. Однако это не исчерпало инцидента — оригинал-то бесследно исчез. Пока самые опытные дознаватели спецслужб и ведающие сотрудники Управления императорского двора вскрыли только факт вопиющего нарушения инструкции ответственным за передачу ордена в аэропорту.

Вместо того, чтобы лично проследить всю цепочку вплоть до получения секретного груза капитаном воздушного судна, он понадеялся на клерков авиакомпании. В результате, как предполагают, "Золотое руно", на котором, кстати, была лишь привычная надпись "ценный груз", попало в обычный багаж вместо капитанской почты. А затем его следы теряются...

Андрей ВАРЛАМОВ.

Брак больше не в цене

На протяжении многих лет в европейских странах наблюдается тенденция к снижению числа заключенных браков (исключение: Греция и Люксембург). По данным французского Национального института статистических и экономических исследований (JNSEE), наиболее серьезно эта проблема стоит во Франции, где с 1990 по 1993 год количество браков снизилось на 4%, а в 1994 год стал просто "рекордным" за весь послевоенный период: было создано лишь 255200 новых семей, что на 6% меньше, чем в 1993 году.

Одновременно увеличивается и средний возраст вступления в первый брак: 28,7 — для мужчин и 26,6 — для женщин. Среди "новоиспеченных" супружеских пар молодежь до 25 лет составила не более четверти от общего количества. В основном молодые люди предпочитают подождать около трех лет, прежде чем узаконить свои отношения.

Известно, что возраст вступления в первый брак тесно связан с экономической ситуацией в стране. До середины 70-х брачные узы служили тому, что человек благодаря им приобретал стабильное положение в обществе, однако после союзы стали заключаться все позже и позже... или никогда. Сегодня во Франции каждая пятая женщина в возрасте до 35 лет одинока и 15% женщин сорока лет не были замужем. Большинство из них предпочитает не узаконивать свои длительные внебрачные связи, и при этом наличие детей не является достаточным поводом к тому, чтобы это сделать. Гражданские браки возникают, невзирая на возраст и социальное положение, о чем свидетельствует хотя бы тот факт, что в 1993 году во Франции число детей, рожденных вне брака, увеличилось в три раза.

Татьяна КАЗАК, РИД, по материалам зарубежной прессы.

Спадарыня Шродэр любіць спагеці, коней і збіраецца ў Брусель

Герхард Шродэр, прэм'ер-міністр зямлі Ніжняя Саксонія, — адзін з найбольш уплывовых палітыкаў Германіі. Многія бачаць яго ў якасці будучага канцлера ФРГ.

Я сустракаўся з ім у Гановеры ў 1990 годзе ў час складанай выбарчай кампаніі за крэсла прэм'ер-міністра зямлі Ніжняя Саксонія. Тады сацыял-дэмакраты на чале са Шродэрам літаральна вырвалі перамогу ў сваіх галоўных сапернікаў з ХДС, якіх вялі такія вопытныя і ўплывовыя лідэры, як Альбрэхт і Рыта Зюсмут. Ён тады ўразіў мяне і сваімі развагамі перад выбаршчыкамі, і спакоем у самыя драматычныя моманты выбарчай кампаніі.

Актыўную грамадскую дзейнасць вядзе і яго жонка Хільтрут Шродэр. Цяпер яна ўзначальвае дабрачынны фонд зямлі "Дзецям Чарнобыля". На Вялікдзень яна завітала ў Мінск, і я сустрэўся з ёю. Спадзяюся, фрагменты гутаркі будуць цікавымі для чытачоў.

— Спадарыня Шродэр, я ведаю, што Вы і ваш фонд "Дзецям Чарнобыля" шмат дапамагае тым, каго напаткала атамная бяда. Штогод вы пастаўляеце прыбораў і лекаў больш як на мільён марак, што патрабуе вялікіх намаганняў і розных арганізацыйных цяжкасцей. Чаму Вы гэта робіце? Што рухае вамі?

— Калі здарылася тая страшная аварыя ў Чарнобылі, маёй малодшай дачцы было дзевяць гадоў, а старэйшай — чатырнаццаць. Я вельмі занепакоілася іх будучыняй. На шчасце, нам пашанцавала. Чарнобыльскае воблака прайшло бокам. Але ж наша шчасце стала няшчасцем для іншых, для многіх дзяцей Расіі, Беларусі і Украіны. І я вырашыла, што нельга заставацца ўбаку.

— Чарнобыль Германію зусім не зачапіў?

— Нашу зямлю Ніжняя Саксонія не. Але на поўдні, у Баварыі, радыеактыўныя выпадкі былі. Там выяўлены высокі ўзровень радыяцыі ў сухім малацэ, і яго даявлося знішчаць. У некаторых месцах быў забаронены збор грыбоў і ягад.

— Напэўна, і ў вас былі адпаведныя праверкі на радыяцыю?

— А як жа.

— Фрау Хільтрут Шродэр, раскажыце трохі аб сям'і. Чым займаюцца вашы дочкі?

— Старэйшая вучыцца на ветэрынара, а малодшая заканчвае школу.

— У вас ёсць хобі?

— О, так. Трымаю жывёл.

— Колькі і якіх?

— Трое коней.

— Нашто іх трымаеце?

— Як нашто? Гэта ж такія цудоўныя жывёлы. У Саксоніі ёсць знакаміты конезавод. Дык вось, нашы гадаванцы адтуль. Малодшая дачка выступае на іх на скачках.

— А яшчэ якія жывёлы ў вас?

— Сабакі.

— Колькі?

— Тры.

— Гэта ж турбот з імі колькі!

— Так, але і цікава. Мы часта бываем з мужам стомленымі, але шчаслівымі.

— А які ў вас дом?

— Маленькі. У нас вялікі сад.

— Што значыць маленькі?

— Ну, месца ўсім хапае.

— Колькі пакояў?

— Дзесяць.

— Не цяжка здагадацца, колькі працы патрабуе догляд жывёл, сада, прыбіранне пакояў... Вы самі ўпраўляецеся з такой вялікай гаспадаркай?

— Так. Сад я даглядаю з мужам. Увіхацца з жывёлай дапамагаюць дочкі. А ў пакоях падсабляе наводзіць парадак работніца, якая працуе ў нас тры дні ў тыдзень.

— Абедаеце дома ці ў рэстаране?

— У абедзенны перапынак я заўжды імкнуся быць дома. У гэты час прыходзіць са школы малодшая. І я лічу, што ў такім выпадку нехта з бацькоў абавязкова павінен быць дома.

— Вы любіце гатаваць абед?

— Люблю.

— Якую страву?

— Спагеці. І бульбяныя аладкі. Дранікі па-вашаму. Гэта мая любімая ежа.

— Што для вас сям'я?

— Гэта для мяне штосьці вельмі важнае. Бадай, самае важнае ў жыцці.

— Чаму?

— Таму што яна вельмі патрэбна дзецям.

— Як выхоўваеце дзяцей?

— Лічу, што ім трэба даваць свабоду, але акрэсліваць яе пэўнымі межамі. Раскажу адну гісторыю.

Калі я ўпершыню збіралася сюды, у Беларусь, малодшая дачка моцна раззлавалася, калі даведалася аб маім намеры. Даказвала мне: так, іхнім дзецям трэба дапамагаць, але ж ты гэта можаш рабіць і тут, у Гановеры. У цябе дзве дачкі. Ты аб іх думай. Да таго ж там небяспека.

Як я вярнулася з Беларусі, яна тыдзень не размаўляла са мной. Пазней я давала ёй чытаць тое-сёе пра Чарнобыль, наладзіла сустрэчы з беларускімі дзецьмі, якія бывалі ў Саксоніі. Яна многае зразумела і цяпер падтрымлівае мае намаганні ў гэтай справе... Вось так уплываем на дачок. Яны павінны самі вырашаць, як паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі.

— Не магу не распытаць пра мужа. Многія гавораць, што ён адзін з рэальных прэтэндэнтаў на пасаду канцлера Германіі.

— Так, я чула пра такое.

— Дарэчы, як Вы з ім пазнаёміліся?

— Дзякуючы палітыцы... Ён быў кандыдатам у дэпутаты парламента па маёй выбарчай акрузе. Ну вось, у час перадвыбарных сустрэч і пазнаёміліся.

— Які ў яго характар, памкненні?

— Скажу так. Мне падабаецца тая палітыка, якую ён праводзіць, і я яго цалкам падтрымліваю.

— А якую палітыку ён праводзіць?

— Такую, каб у нашых дзяцей была добрая будучыня.

— Якой ён хоча бачыць Германію?

— Лепшай, чым сёння. Германія не павінна жыць ізалявана, а ў інтэграцыі з еўрапейскімі дзяржавамі. І яна будзе дапамагаць тым, хто мае патрэбу.

— Пакуль Вы гутарылі з нашымі медыцынскімі работнікамі, Вас двойчы клікалі да тэлефона. Мне здалося, што званіў муж. Я не памыляюся?

— Не. Адзін званок быў ад яго, з Гановера.

— Цікавіўся, як даехалі?

— Так... І яшчэ адно. Старэйшая дачка на абследаванні ў бальніцы. Я, вядома, не магла перанесці сваю паездку ў Беларусь, але маё сэрца рвецца і ў Гановер... Так што званок адтуль патрэбны мне.

— Вы з мужам марыце аб лепшай Германіі. Якія праблемы ў Германіі сённяшняй?

— У нас нанеслі вялікую шкоду прыродзе. Прыходзіцца многае ўзнаўляць. Праблема з захаваннем радыеактыўных астаткаў. Цяжкасці з энергіяй. Трэба эканоміць, паўней выкарыстоўваць энергію ветру, сонца, што патрабуе новых тэхналогій і намаганняў.

— Мэта Вашага цяперашняга візіту на Беларусь?

— Наведаць Гомельшчыну. Каб на месцы высветліць, якая патрэба ў леках і медыцынскім абсталяванні. Ну, і сустрэцца са сваімі добрымі партнёрамі з Беларускага таварыства дружбы, з вашымі медыкамі... Меркавала прывезці вам добрую вестку...

— Якую?

— Аб выдзяленні значных сродкаў еўрапейскімі структурамі. На жаль, у Брусэлі палічылі, што Беларусь і так атрымлівае немалую дапамогу. Словам, адмовілі. Толькі я не прывыкла адступаць. Тое рашэнне ўнесла карэктывы ў мае планы. Чарговы мой візіт будзе ў сталіцу Бельгіі.

Гутарыў Іван МАКАЛОВІЧ.

Шахматы

Из творчества читателей

Н.БЕЛЬЧИКОВ, А.ПЕТРУСЕНКО

Белые: Крg2, Фh5, Лb4, Cb2, Cf1, Kd5, Kf4 (7).

Черные: Kpe4, Лd1, Ca7, Ch7, Kd4, пп. d6, e7, f2 (8).

Мат в 2 хода.

Сегодня мы предлагаем вниманию любителей шахмат коллективную задачу наших читателей Алексея Матвеевича Петрусенко из деревни Любань Октябрьского района и борисовчанина Николая Ивановича Бельчикова. Свои решения присылайте по адресу: **220013, Минск, ул. Б.Хмельницкого, 10а, редакции "Народной газеты", "Шахматы".**

Победа Гарри Каспарова

В Риге проходил мемориал выдающегося шахматиста нашего времени восьмого чемпиона мира Михаила Таля. Турнир проводился международной профессиональной шахматной ассоциацией и был первым в серии розыгрыша Гран-при. В соревнованиях выступили многие сильнейшие гроссмейстеры, в том числе чемпион мира Гарри Каспаров, претендент на это звание Вишванатан Ананд (Индия), Найджел Шорт (Англия), Владимир Крамник (Россия), Василий Иванчук (Украина), Борис Гулько (США), Артур Юсупов (Германия). Основными соперниками в борьбе за победу были Г.Каспаров, В.Иванчук и В.Ананд. Наибольшего успеха добился чемпион мира. Набрав 7,5 очка в 10 встречах, Каспаров опередил всех соперников и завоевал главный приз. Всего пол-очка уступил победителю В.Ананд. Третий приз достался В.Иванчуку. Исход соперничества во многом предопределила партия между Каспаровым и Анандом, которую чемпион мира провел с блеском. Применив старинный дебют — гамбит Эванса, Каспаров уже на 25-м ходу заставил своего противника сдаться.

Г.КАСПАРОВ — В.АНАНД

Гамбит Эванса

1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cc4 Cc5 4. b4. Именно этот ход предложил в прошлом веке английский капитан Эванс. Жертва пешки ведет к резкому обострению борьбы. 4... C:b4 5. c3 Ce7 6. d4 Ka5 7. Ce2 ed 8. Ф:d4 Kf6 9. e5 Kc6 10. Фh4 Kd5 11. Фg3 g6 12. o-o Kb6 13. c4 d6 14. Лd1 Kd7 15. Ch6 Kce5 16. K:e5 K:e5 17. Kc3 f6 18. c5 Kf7 19. cd cd 20. Фe3 Kh6 21. Фh6 Cf8 22. Фe3 Kpf7 23. Kd5 Ce6 24. Kf4 Фe7 25. Лe1! Тихий заключительный ход, после которого черные не имеют защиты. Поэтому Ананд признал свое поражение.

Шашки

Из творчества читателей

В. ЗАХАРЧУК

Белые: пр. a1, b4, c1, c3, c5, d2, e3, f2, g1, g3 (10).

Черные: пр. a5, a7, b8, c7, d6, e5, e7, f6, g5, g7, h8 (11).

Белые начинают и выигрывают.

Предлагаем вниманию любителей шашечной композиции концовку нашего читателя из Слонима Владимира Ивановича Захарчука. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220013, Минск, ул.Б.Хмельницкого, 10а, редакция "Народной газеты", "Шашки".**

Сверьте решения

Концовка В.Казейко (опубликована 1.02): 1. fg7 d:h4 2. dc3! h:f6 3. ed2 h:e1 4. hg5 f:h4 5. bg3 hf2 6. hg1, или 1... h:h4 2. bg3 d:c1 3. ed2 c:g1 4. hd2 h:f2 5. de1x.

Композиция Л.Спружа ("Народная газета" за 9.02): 1. hg5 f:h4 2. fg3 h:f2 3. g:g5 h:f4 4. hg3 f:h2 5. de3 d:f2 6. cb4 a:c3 7. b:g1x.

Концовка В. Захарчука (опубликована 9.02): 1. ed4 gf6 (если 1... ef4, то 2. dc5 b:d4 3. c:g3 a:c3 4. b:d4x) 2. dc5 b:d4 3.ba3 d:b2 4. a:c1 a:c3 5. cd2 c:e1 6. gf2 e:g3 7. h:b8x.

Композиция С.Гребня (опубликована 11.02): gf4 e:g3 2. ef4 g:e5 3. cb2 a:c1 4. hg5 h:f4 5. ed2 c:e3 6. f:c3 fe3 7. ce1x.

Концовка Н.Кобцева ("Народная газета" за 1.03): 1. fg3 f:h2 2. cd4 c:e3 3. d:h6 ed6 4. cd2 dc5 5. dc3 fe5 6. hg7 ed4 7. c:e5 cb4 8. gf2 bc3 9. gf8 cb2 10. fg3 h:d6 11. f:c1x. Если 8...hg1, то 9. gh8, 8...ba3 9. fg3 h:d6 10. gh8x. Или 6...ef4 7. gf8 cb4 8. f:a3 fg3 9. ab2 gf2 10. g:e3 hg1 11. ba1x, 7...fe3 8. f:b4 ef2 9. g:e3 hg1 10. cd4 с выигрышем.

Задача Н.Бобровника (опубликована 17.03): 1. fe5 d:f6 2. b:b6 e:c3 3. h:b8 f:d6 4. b:g7 c:h8 5. a:c3 h:b2 6. a:c3 hg3 7. gh2 gf2 8. hg3 f:h4 9. de7 h:g3 10. h:f4 g:e5 11. ed6 e:a5 12. ab4x, или 1...d:f4 2. h:c7 f:b8 3. dc7 b:d6 4. hg5 h:f6 5. ab6 c:a7 6. a:e3 a:f2 7. g:h4 и 8. ab4x.

Свои ответы на позиции прислали тт. Грицук (Дрогичинский район), Зголич (Каменец), Змеевская (Мостовский район), Богуш (Берестовицкий район), Инубовский (Ошмяны), Шемет (Волковыск), Сыч (Ельск), Бобровник (Мозырь), Коновалов (Калинковичи), Тишков (Орша), Пинчук (Шумилино), Ларионов (Витебск), Драко (Клецк), Любецкий (Березинский район), Гармаза (Дзержинский район), Савкин (Воложинский район), Ахрем, Коробков, Качан (Минск).

Дайджест без политики

Что пишут, то и читаем...

Своя землица нам пригодится

Путь в собственники земли скоро станет короче для жителей московского региона.

По решению правительства области и с помощью специалистов из Баварии создается Земельный кадастр Подмосковья — автоматизированная информационная система с исчерпывающими сведениями о каждом квадратном метре земли. Это, естественно, облегчит для людей, желающих получить свидетельство на право владения земельными участками, тяжкий труд хождения по инстанциям.

К слову, в прошлом году 1 миллион 600 тысяч граждан стали обладателями заветного свидетельства. Желающих же в несколько раз больше.

(Еженедельник "Мегаполис-континент".)

Т-34 сойдет с постамента

Шествие ветеранов войны откроет 9 мая в Екатеринбурге знаменитый танк Т-34.

Такое решение принял на днях организационный комитет по подготовке к юбилейным торжествам. "Оживленную" специалистами боевую машину снимут с постамента у проходной крупнейшего в годы войны танкового предприятия, где она простояла почти полвека. Отсюда прославленный в боях танк самостоятельно проедет через центр города. А затем снова вернется на свой вечный прикол.

("Общая газета".)

Телесные наказания под запретом?

Государственная комиссия по вопросам образования Китая запретила телесные наказания в школах страны после того, как девятилетняя девочка скончалась от побоев, нанесенных учителем.

В центральной провинции Хубэй, например, телесные наказания до сих пор были обычным явлением. Наставники избивали своих учеников деревянными палками и резиновыми шлангами.

("Эдьюкейшн геральд")

Троя — утонувшая Атлантида?

Немецкий геофизик с мировым именем Гельмут Беккер, обнаруживший в 1992 году так называемый внутренний ров вокруг Трои — города из бронзового века, проводя исследования с помощью магнитных методов, пришел к выводу, что существует и второй — внешний ров.

Если это подтвердится дальнейшими работами, то наши представления о Трое, описанной Гомером, значительно изменятся, поскольку второй ров может свидетельствовать о гораздо больших размерах античного города и соответственно о значительно большем числе жителей, чем до сих пор предполагалось. В свою очередь, это может вызвать и новый интерес к гипотезе археолога Эберхарда Цангера, заявившего в 1992 году, что Троя и есть легендарная утонувшая Атлантида.

(Журнал "Фокус", ФРГ)

Брайам Янг и его 27 жен

В первой половине XIX века в США возникла секта мормонов ("Святые последнего дня"). Одним из руководителей этой секты был Брайам Янг. У него было 27 жен, от которых имел 56 детей. Последний ребенок родился, когда мистеру Янгу было уже 68 лет.

Мормоны, в том числе и Б.Янг, не были распутниками. Наоборот, они, как правило, серьезные и высоконравственные люди. Просто они стремятся следовать положениям Ветхого завета. А там прямо сказано, что прародители рода человеческого Авраам, Исаак и Иаков, так же как и иудейские цари Соломон и Давид, были многоженцами. У Янга все 27 жен ежедневно собирались за одним столом, а каждый вечер вместе молились.

Интересно, что жены так свято верили главе семьи, что даже никогда не ссорились между собой.

("Бостон Глоб", США).

"Мао — мой идеал. У него я учился делать деньги..."

Учение Мао Цзэдуна продолжает оказывать влияние на умы китайцев — причем в последнее время ряды маоистов пополняют не только рабочие и крестьяне, но и... акулы крупного капитала.

"Мао — мой идеал. У него я учился делать деньги", — утверждает Дэвид Тан, всемирно известный тайваньский мультимиллионер. Вот уже несколько лет Дэвид потрясает мир унитазами из чистого золота, дорогими экстравагантными костюмами и бронированным "Роллс-Ройсом", оборудованным душем и кроватью. Однако, оправдывая свою страсть к золотым унитазам, владелец экономической империи напоминает о том, что вождь мирового пролетариата Владимир Ленин в свое время пророчески предсказывал, что придут времена, когда из драгоценных металлов будут изготовлять посуду и бытовые приборы. Таким образом, необычное хобби мультимиллионера является, по его мнению, просто творческим развитием учения Ленина — Сталина — Мао.

У "великого кормчего" учатся капитализму и многие другие китайские предприниматели. Причем весьма успешно: список самых состоятельных людей планеты пополнился в этом году сразу семнадцатью миллионерами из Китая.

(Еженедельная газета "Голос")

Виктор СЛАВКИН: "Так о чем это я?.."

Ах, да — о демонстрации 7 ноября! В 1965 году нам с Марком Розовским заказали сценарий новогоднего шоу в Лужниках. Так и называлось — "Дело N 1965".

Новогодний детектив. Режиссером спортивной части программы был бывший чемпион по гимнастике Серый, бессменный постановщик физкультурных парадов и демонстраций на Красной площади. Вдалеке уже явственно различался 1967 год — год пятидесятилетия Великой Октябрьской социалистической революции, и Серый внутренне уже готовил себя к юбилейной демонстрации. Узнав, что мы оба приверженцы модернистских идей в искусстве, он неожиданно проникся доверием к нам и однажды поделился своими творческими замыслами:

— Я хочу, чтобы на этот раз на Мавзолее стояли Герои труда и космонавты, а правительство шло внизу по Красной площади. Ну, какова идея?

Идея была грандиозная. Но даже в таком сугубо советском жанре, в котором работал Серый, существовала проблема проходимости. В чем я убедился, сидя 7 ноября 1967 года у телевизора. Правительство по Красной площади не прошло.

(Журнал "Столица").

Свежие газеты и журналы читал Иосиф КАЛЮТА.

Диабетики, объединяйтесь!

Министерство юстиции Республики Беларусь зарегистрировало новую общественную организацию — Белорусский диабетический союз. Наш корреспондент задал несколько вопросов председателю БДС Анне Антоновне Вашкевич.

— Правда ли, что в республике, по официальным данным, проживает около 120 тысяч больных диабетом?

— Думаю, цифра эта очень занижена. По данным Всемирной организации здравоохранения, больных диабетом в каждой стране, увы, гораздо больше — один на 20 человек. К тому же этот недуг прогрессирует во всем мире. БДС как раз и должен объединить всех "диабетиков", независимо от возраста и места жительства в республике. Желающие могут звонить прямо сейчас по телефону 295-498.

— Наша газета не первый раз обращается к этой теме, недавно был опубликован довольно скандальный материал о деятельности БГНО "Детский диабет" и его президента Захарова. Как там дела сейчас?

— В конце прошлого года родители больных детей выразили, скажем так, недовольство деятельностью БГНО, в особенности Захарова, и представили в ОБЭП Партизанского РОВД соответствующие факты. Прошло четыре месяца, а ответа из ОБЭП так и не получили.

— Возникновение БДС — своеобразная альтернатива?

— Не обязательно. Ведь существуют, плодотворно работают другие диабетические организации. Наша цель — объединение всех усилий. Мы категорически против всевозможных ссор, расколов. А необходимость создания Белорусского диабетического союза подтвердило заключение договоров о сотрудничестве в оздоровлении больных с аналогичными организациями Беларуси, Германии, Польши.

— Были проблемы при создании БДС?

— Только финансовые. И на первых порах нам очень помогла Белорусская социально-спортивная партия, заместитель ее председателя известный журналист Владимир Довженко. Спасибо им!

В.МОГИЛЕВСКИЙ.

Крымінал

Забрала грошы з сейфа

Магіляўчанка, прыбіральшчыца тралейбуснага парка, аднойчы вырашыла перакваліфікавацца ў... "мядзведніка". Праўда, ускрываць сейфы ёй неабходнасці не было. А вось забраць усё, што знаходзілася ў адным з іх, змагла. Прычым вельмі проста. Калі прыбірала памяшканне касы прадпрыемства, убачыла пакінуты ў сейфе без нагляду ключ, ім лёгка адчыніла дзверцы і забрала два мільёны рублёў. Цяпер жанчына знаходзіцца ў іншым памяшканні з куды больш трывалымі запорамі і пад наглядам міліцыянераў.

Расстраляў сваю сям'ю

Трагічныя выстралы прагучалі а першай гадзіне велікоднай ночы ў доме жыхара Ляхавіч. Падагрэты гарэлкай і сямейнай сваркай, шафёр мясцовай ПМК аграпрамтэхнікі схапіў незарэгістраваную паляўнічую стрэльбу, якую хаваў тайна і незаконна, і ва ўпор расстраляў цешчу, потым забіў дачку-старшакласніцу, параніў жонку. З месца злачынства забойца ўцёк. Міліцыя, паднятая па трывозе, аб'явіла спецыяльны пошукавы план "Сірэна". Мірна здацца забойца не пажадаў, аказаў узброенае супраціўленне. Тады адкрыў агонь у адказ з аўтамата і супрацоўнік крымінальнага вышуку. Ад агнястрэльных раненняў злачынца памёр у бальніцы.

У аэрапорце прызямліўся... аўтамат

У накапляльніку міжнароднага сектара аэрапорта "Мінск-2" пры мытным аглядзе рэчаў знойдзена нічыйная сумка, а ў ёй — аўтамат Калашнікава без патронаў і са спіленым нумарам. Груз прыбыў самалётам, які выконваў рэйс з Тбілісі ў Мінск. Зброя канфіскавана, уладальнік, убачыўшы такую сітуацыю, вядома, не аб'явіўся, і міліцыі ўстанавіць яго пакуль што не ўдалося.

А вось уладальніка кулямёта Дзегцярова бабруйская міліцыя знайшла. На жаль, позна. Пасля таго, як прагучалі неасцярожныя выстралы, ад якіх загінуў чалавек.

Як баранавіцкі зэк за доларамі хадзіў

Спалоханы і ўсхваляваны мужчына прыбег у дзяжурную часць івацэвіцкай міліцыі а палове адзінаццатай ночы. Літаральна пятнаццаць мінут назад яго разарыў невядомы, які быў у масцы. Зайшоў у незачыненыя дзверы дома і пачаў патрабаваць у гаспадара тысячу долараў, пагражаючы пры адмове забіць сына. Прыйшлося аддаць наяўныя. Але гэтага злачынцу было мала, і ён прыхапіў яшчэ і "Жыгулі", на якіх і уцёк.

Міліцыя аператыўна ўвяла план "Перахоп", але налётчыку ўдалося ўцячы. На шчасце, ненадоўга. Аператыўнікі сарвалі з яго маску і ўбачылі, што пад ёй хаваўся іх нядаўні кліент, які адбывае пакаранне ў Баранавіцкай спецкамендатуры.

Уладзімір СТРЭЛЬСКІ, Белінфарм.

Футбол

Будем откровенны — мы где-то на уровне Мальты

Алесь СИВЫЙ

Каюсь, грешен! В минувшем футбольном отчете я упомянул в припадке радости, что футбольная Мальта сродни горнолыжной Беларуси. Ан нет!

Как поется в песне, недолго музыка играла. Матч национальных сборных Беларуси и Мальты — тому подтверждение. Я не собираюсь описывать все 90 минут игры — кто хотел, тот посмотрел по "телеку". Видели, как ликовали болельщики после нечаянного гола Тайкова, видели наверняка и беспомощность Андрея Сацункевича после удара с разворотом мальтийского футболиста. Ничья. 1:1. Все остальное вряд ли достойно комментария, потому как наша сборная, укомплектованная почти по полному разряду, так и не смогла удовлетворить изголодавшихся по весне и хорошему футболу болельщиков. А это — главное.

Отсутствие хорошей игры у белорусских футболистов, наверное, испортило настроение и у белорусской милиции, охраняющей подступы к пресс-центру.

— Вы куда лезете, собаки! — ласково встретило журналистов у входа подобие человека со знаками отличия майора. — У вас пропуски в ложу "Г". Ну и идите в свое г...

Корреспонденту спортивного еженедельника "Прессбол" Сергею Левшину и вашему покорному слуге как "особо несговорчивым" пришлось довольствоваться не "особыми" пропусками, а...испытать угрозу в виде поднятых резиновых дубинок и воспользоваться знакомством с депутатами. Прошли...

У каждого своя работа. Сразу стало стыдно не только за нашу Федерацию футбола (ей-Богу, даже Президента не пропустили бы без таинственного спецпропуска), но и за всю державу в целом. Нам еще раз указали, кто мы — ложа "г". Причем указали свои же. А мы еще требуем извинений от болгар по поводу нашумевшего инцидента с хоккеистами.

Впрочем, пресс-конференция началась вовремя, на ней присутствовали старший тренер сборной Беларуси Сергей Боровский и старший тренер сборной Мальты Пьетро Геден.

— Господин Геден, вы сыграли вничью со сборной Беларуси. Означает ли это, что футбольные команды Мальты и Беларуси равны по силам?

— Зачем так категорично? Сегодня мои ребята могли проиграть, но могли и выиграть. Госпожа удача! Скажу только, что результатом мы очень довольны.

Сергей Боровский: "Не все удавалось, не все получалось. Не всем доволен. "Сбрасывать" ничью на счет болезней и усталости игроков не буду, так что можете считать, что весь удар принимаю на себя".

Между тем специальный корреспондент "НГ" Дмитрий Варавко "вылавливал" на выходе из раздевалки игроков обеих команд.

Кармел Бузуттил: "Абсолютно все в Минске понравилось. И счет в матче, и гостиница "Планета", и белорусские девушки..."

Александр Метлицкий: "Обидно, конечно, что аккурат после моей замены мальтийцы забили гол. "Потянул спину" — ничего не поделаешь. Хотя предвосхищаю, что многие скажут: "Не заменили бы Метлицкого..."

Андрей Зыгмантович: "Почему вы считаете, что я лучше всех выглядел сегодня в сборной Беларуси? Смотрелись все неплохо. В Испании не все клубы так играют".

Андрей Сацункевич: "Когда мальтийский нападающий пробил, я был немного "на выходе", поэтому и не дотянулся. Моя вина, конечно."

В последних строках репортажа хотелось бы процитировать: "Дедушка, а что такое кранты?"

"Кранты, внучек, это когда уже нет никаких шансов на выход в финал чемпионата Европы по футболу".

Кранты, короче.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

Пятніца, 28 красавіка

Беларускае тэлебачанне

17.30 "Пілiпок". Мультфільм.
17.40 Тэлеклуб "Удача".
18.00 АТН, Бі-бі-сі, Сі-эн-эн.
18.45 "Абнаўленне". Светлагорскае ВА "Хімвалакно".
19.00 Пратакол. Міжнародная праграма.
19.20 Дыялогі аб спорце.
19.40 Тэлесябрына. Імгненне шчырасці.
20.00 Пяць вечароў са Стэфаніяй Станютай. Частка 3-я.
20.35 "Скрыжалі". Уінстан Чэрчыль.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.40 Студыя "Палітыка".
21.55 Кліп-канцэрт. Алег Газманаў.
22.05 Эканамікст.
22.15 Вясёлы уік-энд.
22.25 "Акалада". Музычна-забаўляльная праграма.
22.55 Шоу-прагноз.
23.00 Навіны.
23.20 Вячэрні ілюзіён. "Ніці-гангстэр".
1.05 Пад купалам Сусвету.

I канал

8.00, 11.00, 14.00, 23.15 Навіны.
15.30 Эх, Самара-гарадок.
15.50 "Палунаем у зорным небе". 5-я серыя.
16.05 Рок-урок.
17.00, 20.00 Час.
17.20 Чалавек і закон.
17.50 Бамонд.
18.10 "Аляска Кід".
19.00 Поле цудаў.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.45 "Справа Сен-Рамана".
21.35 Версіі.
21.55 Погляд.
22.35 Музагляд.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
15.30 Рознакаляровая прызма.
16.20 У гэты дзень...
16.25 Новая лінія.
16.55 "Тайна закінутага рудніка". Маст. фільм.
17.50 Мульці-пульці.
18.00 Гарачая дзесятка.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 "Санта-Барбара".
20.30 У свеце аўта-і мотаспорту.
21.05 "Перпендыкулярнае кіно".
22.30 Рака часу.
22.35 Аўтаімгненне.
22.40 Шахматны фестываль "Крамлёўскія зоркі-95".
22.55 Хакей. Расія—Германія.

Санкт-Пецярбург

17.25 Антрэ.
18.00 Тэлемагазін.
18.10 Вялікі фестываль.
18.45 Спартыўныя навіны.
18.55 "Мануэла".
19.40 Маст. фільм "Духаў дзень".
21.55 Спорт, спорт, спорт...
22.05 Тэлеслужба бяспекі.
22.20 Гараскоп.
22.30 Анталогія зарубежнага кіно. "Аграбленне".
0.05 "На біс". Група "Форум".

НТБ

17.30 "Цудоўная сямёрка".
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Футбольны клуб.
19.20 "Іван Васільевіч мяняе прафесію". Маст. фільм.
21.35 "Паліцыя Маямі. Аддзел нораваў".
22.30 Часінка.
23.15 "Дзяцінства, прызнанне і першыя доследы Джакома Казановы, венецыянца". Маст. фільм (Італія).

Надвор'е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ў Гродне, Магілёве, Віцебску — 13—15, Брэсце, Гомелі і Мінску — 14—16 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак: 29-га па поўначы дажджы, магчымы навальніцы; 30-га пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы — 1—6 градусаў цяпла, 30-га месцамі замаразкі да мінус 2 градусаў. Тэмпература паветра ўдзень 29-га — 9—14, 30-га — 13—18 градусаў цяпла.

Астранамічны каляндар — 28.04

Узыход і захад сонца: Мінск — 5.40, 20.34; Віцебск — 5.26, 20.28; Магілёў — 5.30, 20.23; Гомель — 5.29, 20.18; Гродна — 5.54, 20.51; Брэст — 6.02, 20.44.

Даўжыня дня ў Мінску — 14 гадзін 54 мінуты.

Маладзік — 29 красавіка.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Даведкі па тэл.: 68-28-70, 68-25-59.
Рэкламнае бюро — тэл. (0172)68-28-11, тэл./факс (0172) 68-25-29, 68-25-28.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул.Б.Хмяльніцкага, 10а.

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
Адрас: Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка. 250 разоў у год.
Падпісана ў друк у 19.10. Заказ №1267.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва"Беларускі Дом друку".
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар Мікалай ГАЛКО